8. **Фальклор** у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 342 с.

9. **Этымалагічны** слоўнік беларускай мовы / рэд. В. У. Мартынаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – Т. 2 : В. – 244 с.

Мішына В.І. *(г. Полацк)*

СІМВАЛІЧНЫ СТАТУС ЭЛЕМЕНТАЎ ТРАДЫЦЫЙНАГА КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТУ Ў ВЯСЕЛЬНЫМ ФАЛЬКЛОРЫ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ

У традыцыйным абрадавым комплексе вяселля, уласцівым Беларускаму Падзвінню, сімвалічную інтэрпрэтацыю набываюць самыя разнастайныя (як прыродныя, так і антрапагенныя) аб'екты культурнага ландшафту. Яны служаць сродкамі мадэлявання і структуравання абрадавай прасторы і арганічным чынам упісваюцца ў рытуальны кантэкст, выконваючы важнейшыя рытуальныя функцыі, суадносныя з глыбіннай семантыкай вяселля як абраду пераходу. Некаторыя элементы культурнага ландшафту (напрыклад, дом (сядзіба), царква, дарога) дастаткова добра прадстаўлены як на ўзроўні разгортвання вясельнага абраду ў рэальнай прасторы, так і ў межах міфапаэтычнай прасторавай мадэлі, адлюстраванай у вясельных песнях і галашэннях. У сваю чаргу, шэраг аб'ектаў (напрыклад, гара, рака, возера, мост, і да т. п.) практычна не задзейнічаны ў рэальным абрадзе, не маркіруецца якімі-небудзь значнымі абрадавымі дзеяннямі, аднак, з'яўляючыся неад'емным складнікам традыцыйнай карціны свету, надзяляецца багатай сімволікай і шырокім спектрам рытуальных функцый, што фіксуюцца ў багацейшым пласце вясельнага абрадавага фальклору.

Рака (возера), брод, мост, пераправа. Па вызначэнні А.В. Гуры, «пераправа праз ваду – найбольш празрыстая прасторавая метафара рытуальнага "пераходу", адэкватная яго тэрнарнай структуры, дзе ў якасці мяжы выступае водная прастора (рака, мора, полая вада і да т. п.), якая пераадольваецца ўброд, уплаў, на чоўне ці на караблі, па мосце ці кладцы, пераскокваннем і іншымі спосабамі» [6, с. 638]. Сам вобраз воднага аб'екта выступае найперш у якасці граніцы, якая адасобліває локусы маладога і маладой: «Я й радзілася – не была, // Куды мяне матулька аддала // Ці за цёмныя барочкі, // Ці за сінія азёры?» [13, с. 65]; «Стрэлкамі рэчанька машчона // Куды наша Ганначка звязёна» [5, с. 72]. У гэтым кантэксце шлях дружыны жаніха, што едзе да нявесты, палягае праз мост: «А ні зыбліся, кляновый мосцік на ряцэ, // А там паедзіць Іванічка з дружыный!» [10, с. 395]. Гэты шлях поўны перашкод і небяспекі, што ўвасабляецца ў выглядзе няўдалага пераезду праз мост:

«А ехалі сваты па калінавым мосту, // Масты паламілі, коній патапілі // Коній патапілі, сукні памачылі» [13, с. 33].

Адначасова ў масіве вясельнага фальклору вылучаюцца тэксты, дзе матыў пераправы праз водны аб'ект (пераезду праз мост) фігуруе менавіта як увасабленне абрадавага пераходу: «Клічыць-гукаіць Мільянка // Ля піравозу стоючы // Піравозьнічка просючы: // Піравозьнічык маладэй, // Падай пяравоз залатэй! // Я ж табе дорага заплачу // За сябе, малайца – чірванца, // За сваю дзеваньку сто рублей, // За сваю дружыну – палціну, // За свацьціньку – рубліну [10, с. 362]. Да гэтай жа групы можа быць аднесены сюжэт пагоні брата нявесты за сястрой з патрабаваннем вярнуць яе з усімі атрыбутамі дзявочага статусу: «Зрыжалі конікі ны браду // Пачулі пагоню пызаду // Што брат зы сястрой гоніцца, // Гоніцца, гоніцца, броніцца: // Пастой, швагрушка, ні ўіжжай, // Дам табе коніка-варанца, // Вярні маю сястрыцу с-пыд вінца, // Дам табе коніка пры красе // Вярні маю сястрыцу пры касе // Дам табе коніка пры злоці // Вярні маю сястрыцу пры сноці» [10, с. 364].

У вясельным фальклоры віцебска-пскоўскага і віцебска-смаленскага памежжа знайшла ўвасабленне і міфалагема Дуная як найбольш сакралізаванай ракі славянскага свету. Пры гэтым яна прысутнічае ў тэкстах, прымеркаваных да розных этапаў вяселля, а спектр семантычных значэнняў вобразу Дуная знаходзіцца ў межах усё той жа сімволікі мяжы і абрадавага пераходу. Так, на Дунаі адбываецца сустрэча нявесты і жаніха: «Праз Дунай, праз ціхі Дунай // Ляжыць дашка, дашка цёсаная, // На тэй дашцэ ляжыць прайнічак, // Прайнічак, прайнічак маляваненькі. // Алёна, Алёна там дары мыла // Маладзец Дзяніска там каня паіў» [1, с. 145]; Дунай выступае адначасова ў якасці мяжы і як персаніфікацыя самога жаніха: «– Не плач, Мар'ечка, не рыдай // Павязём цябе за Дунай. // – Я ж таго Дунаю не знаю. // – Ціхенькі Дунай – Іванька, // Быстрая рэчушка – Мар'ечка» [4, с. 86]. Нарэшце, Дунай увасабляе і сам локус жаніха: «Не жалеіць Манечку радзіна: // Проці ночанькі вон гонюць, // А вароцік не адчынюць, // І дарожаньку не ўкажуць. // Толькі жаласліў брацітка, // Ён сястры варотцы адкрываў, // Ён сястры дарожку ўказаў: // – Вот табе, сястрыца, дарога // Да свёкравага парога. // Вот табе, сястрыца, другая, // Да свякровага Дуная [4, с. 406].

У шэрагу вясельных песенных тэкстаў фігуруе і такі спецыфічны для беларускага традыцыйнага культурнага ландшафту элемент, як **мора.** Спецыфіка ў дадзеным выпадку палягае ў тым, што пры адсутнасці мора як рэальнага геаграфічнага аб'екта, у беларускай традыцыі яно выступае як семантычна насычаны складнік міфапаэтычнай карціны свету (што ўвасоблена ў шматлікіх узорах такіх жанраў, як казкі, замовы, легенды і паданні, абрадавы і пазаабрадавы фальклор) [11, с. 311–312].

Ва ўзорах вясельнага абрадавага фальклору Падзвіння і сумежных тэрыторый адносна мора выяўляюцца тыя ж самыя семантычныя пласты, што характэрны для водных аб'ектаў увогуле – метафарычнае ўвасабленне

шлюбу (абрадавага пераходу) і памежны статус. Відавочна, што шлюбную сімволіку маюць найперш сюжэты, у якіх маладая бярэ на моры ваду і тоне: «У панядзелак рана // Сіня мора іграла, // Там наша Алена // Вадзічушку брала. // Вёдры начарпнула, // Сама ўтанула. // Утануўшы крычала, // А бацюшка чуець, // Не ідзець, не ратуець. // – Не мне слуга будзець. // А Іванушка чуець, // Ідзець і ратуець. // – Яна мне слуга будзець» [4, с. 233–234]; «Чорная мора іграла // Надзічка ваду брала // У мора ўтапілася // У татулькі прасілася: // – Ратуй, татулька, ратуй // – Ня буду ратуваці, мне із табой ні вікаваці. // Сінія мора іграла // Надзічка ваду брала // У мора ўтапілася // У мілага прасілася: / – Ратуй, міленькі, ратуй // – Я ж буду ратуваці – мне із табой вікуваці» [9, с. 104].

Мора ў якасці мяжы паміж локусамі жаніха і нявесты фігуруе ў песнях, прымеркаваных да завяршальнага этапу вяселля: «У панядзелак рана сіняе мора йграла, // Сіняе мора йграла, Валечка ваду брала. // Валечка ваду брала, у свой бок паглядала, // У свой бок паглядала, матульку к сабе звала: // Мамка мая родная, пераедзь сіняе мора, // Пераедзь сіняе мора, выкупі мяне з гора» [5, с. 226]; «Не зязюлька наша Ганулька, // Ай, заляцела за мора // А ў вялікае гора. // – Брацілкі мае родныя, // Ой, памасціце вы мора, // Ой, вазьміце мяне з гора» [5, с. 369]. У прыведзеных узорах звяртае на сябе ўвагу матыў звароту маладой да прадстаўнікоў свайго роду з просьбай пераехаць/памасціць мора і выбавіць яе «з гора». Немагчымасць падобнага роду дзеянняў увасабляе фактычную завершанасць абрадавага пераходу і незваротнасць змены статусу нявесты.

Гара. У вясельным абрадавым фальклоры Падзвіння знайшоў сваё адлюстраванне таксама міфапаэтычны вобраз гары. Семантычна гара суаднесена з міфалагемай Сусветнага дрэва / Сусветнай восі, рэпрэзентуе Цэнтр Сусвету і мадэлюе яго вертыкальную структуру [8, с. 113], а таму арганічным чынам фігуруе ў абрадавых фальклорных тэкстах. Характэрна, што ў вясельным фальклоры вобраз Сусветнага дрэва / Сусветнай восі мадэлюецца з дапамогай канструкта «царква на гары», што, па сутнасці, надае вянчанню статус падзеі касмічнага парадку: «На гарэ царкоўка, // А ў ней свечкі цеплюцца, // Там наша Маша богу моліцца» [12, с. 316]; «На двары часты дождж барабаніць, // А Іванька з таткам пагаварываець: // – Пара, пара, татанька, пара коні сядлаць. // Дзіця маё, Іванька, пазасёдланы, // І замузданы, і ў варотах стаяць. // Толькі сесць молайцу ды паехаці // Пад тую гару крутую, // Пад тую цэркаў святую./ / Ай, попе, попе, бацька наш. // Звянчаў свадзьбу ў добры час. // Не поп свадзьбу вянчаець, // А добрая гадзіна злучаець» [2, с. 550].

Па вызначэнні А.В. Гуры, «гара выступае найперш як сімвалічная прасторавая граніца, што раздзяляе прастору жаніха і нявесты» [7, с. 16]. У падзвінскім вясельным фальклоры гэта ўвасоблена рознымі спосабамі, напрыклад, праз апісанне шляху жаніха да нявесты і перашкод, якія даводзіцца пераадольваць на гэтым шляху: «Дальняя дарожка, // Яшчэ круты

горы» [1, с. 306]; «Проці сваняга двара // Да высокая гара, // Да ні сысці, ні з'ехаць, // Ні сакалом зляцець» [3, с. 25]. Адваротна сіметрычна гара выступае як памежны локус і з кропкі гледжання нявесты: «Падумай, Надзечка, падумай, // Як завязуць цябе дадому, // Як за тыя горы высокія, // Як за тыя гаі зялёныя» [4, с. 126]; «Сястра ў сястры дапытваецца: // Куды, сястра, сабіраешся, // Ці за горы камяністыя, // Ці да свякрові наравістай?» [4, с. 120].

Адметна, што «горы» выступаюць не толькі ў якасці маркера прасторавай граніцы, яны ж характарызуюць і ўласна локус жаніха: «Гапуська, дзевачка, у каго ж ты пыталася, // Куды ж ты хваталася? // Там горы гарыстыя, людзі наравістыя, // Там горы няроўныя, свякроўкі нярадныя!» [10, с. 397]; «А ў панідзелак рана // Плакала маладая Сахвейка: // Вада мая далёкая // Горы мне высокіі. // А ва ўторык рана // Сміялася Сахвейка: // Вада мая блізкая, // Горы мне нізкіі» [10, с. 377]. Відавочна, што ў апошнім з прыведзеных прыкладаў змена характарыстыкі «гор» («высокія» – «нізкія») звязана з завяршальнай стадыяй абрадавага пераходу, пачаткам «далучэння» нявесты да свайго новага локусу, «асваеннем» яе новай жыццёвай прасторы.

Такім чынам, пры ўсёй разнастайнасці сімвалічных значэнняў, якімі валодаюць разгледжаныя аб'екты культурнага ландшафту ў міфапаэтычнай карціне свету, непасрэдна ў сістэме традыцыйнага вясельнага фальклору Беларускага Падзвіння іх можна разглядаць у наступных найбольш істотных вымярэннях:

– як элемент сістэмы граніц, што аддзяляюць «сваё» і «чужое» (у плане ўзаемадзеяння вясельных груп жаніха і нявесты);

– як маркер «сваёй» ці «чужой» абрадавай прасторы;

– як увасабленне дынамікі змены статусных характарыстык (халасты/незамужняя – жанаты/замужняя, дзяўчына – жанчына/жонка, хлопец – мужчына/муж) галоўных удзельнікаў вяселля ў працэсе абрадавага пераходу.

ЛІТАРАТУРА

1. **Вяселле** : песні : у 6 кн. / рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 1 / склад. Л. А. Малаш. – 1980. – 680 с.

2. **Вяселле** : песні : у 6 кн. / рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 2 / склад. Л. А. Малаш. – 1981. – 831 с.

3. **Вяселле** : песні : у 6 кн. / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 4 / склад. Л. А. Малаш. – 1985. – 733 с.

4. **Вяселле** : песні : у 6 кн. / рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 5 / склад. Л. А. Малаш. – 1986. – 708 с.

5. **Вяселле** : песні : у 6 кн. / рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 6 / склад. Л. А. Малаш. – 1988. – 664 с.

6. **Гура, А. В.** Брак и свадьба в славянской народной культуре: семантика и символика / А. В. Гура. – Москва : Индрик, 2012. – 936 с.

7. **Гура, А. В.** Об одном пространственном мотиве славянской свадьбы (ландшафтный код) / А. В. Гура // Славяноведение. – 2009. – № 6. – С. 15–23.

8. **Дучыц, Л.** Гара / Л. Дучыц, У. Лобач // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / [склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка]. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 113.

9. **Песні** Велеўшчыны ў запісах Міколы Залатухі : з электрон. дадат. / уклад., уступ. арт. і паказ. Т. В. Валодзінай ; запіс тэкстаў М. Залатухі ; падрыхт. аудыядыска С. Лісіцы. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 247 с.

10. **Романов, Е. Р.** Белорусский сборник : [в 9 вып.] / Е. Р. Романов. – Вильна, 1886–1912. – Вып. 8 : Быт белорусса. – 1912. – 600 с.

11. **Швед, І.** Мора / І. Швед // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / [склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка]. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 311–313.

12. **Шейн, П. В.** Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями, с приложением объяснительного словаря и грамматических примечаний / П. В. Шейн. – Санкт-Петербург, 1874. – 566 с.

13. **Шейн, П. В.** Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. – Санкт-Петербург, 1887–1902. – Т. 1, ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белорусса в обрядах и песнях. – 1890. – 708 с.

Мікуліч М.У. *(г. Мінск)*

ЗАБЫТЫ ПАЭТ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АЛЕСЬ ДУБРОВІЧ

Значнае месца ў літаратуры Заходняй Беларусі належыць Алесю Дубровічу – таленавітаму выхадцу з асяроддзя масавай самадзейнай паэзіі Глыбоцкага краю. Мы ведаем, што яго самыя раннія выступленні ў друку высока цанілі не толькі блізкія па ідэйна-светапогляднай арыентацыі і палітычнай платформе творцы левага, камуністычна-партыйнага, накірунку – Р. Шырма, В. Таўлай, Г. Новік, Максім Танк, Анатоль Іверс, але і А. Станкевіч, Я. Шутовіч, А. Бярозка, якія належалі да супрацьлеглай уплывовай грамадска-палітычнай сілы – партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя».

Сёння нам дакладна вядома, што нарадзіўся Алесь Дубровіч (сапр. – Аляксей Рыгоравіч Рэдзька) 20 сакавіка 1910 г. не ў в. Галубічы, як памылкова сведчаць многія нашы крыніцы, у тым ліку і біябібліяграфічны слоўнік «Беларускія пісьменнікі», а ў в. Каралевічы Дзісенскага павета Віленскай губерні ў беднай сялянскай сям'і Рыгора Францавіча і Лукер'і Мікалаеўны Рэдзькаў, стаўшы ў іх шостым па ліку дзіцем. Рос і выхоўваўся будучы паэт ва ўмовах суцэльнай беднасці і нястачы, скончыць яму давялося толькі мясцовую польскую пачатковую школу – шматдзетная сям'я не магла дазволіць сабе такую раскошу, як аплата далейшай вучобы няхай сабе і вельмі здольнага, прагнага да навукі сына. Каб неяк дапамагчы бацькам пракарміць дзяцей і пражыць, Аляксею, як і яго старэйшым братам Дзмітрыю і Васілю, з ранніх гадоў даводзілася наймацца пастушком, парабкам да заможных гаспадароў.